ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ВАНДРОЎКА Ў ДУДУТКІ 5

ГУКІ КЛАСІКІ КАЛЯ МІНСКАЙ РАТУШЫ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 ЛІПЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 133 (28749)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КОЦІК, намеснік генеральнага дырэктара ВА «Беларуснафта»:

«Беларуснафта» стала дзяржаўным аператарам па стварэнні ў краіне зараднай сеткі для электрамабіляў, да 2024 года кампанія сфарміруе разгалінаваную электразарадную сетку. Ужо да канца 2018 года сетка электразарадак «Беларуснафты» павялічыцца да 100 станцый. Больш за 40 з іх з'явіцца ў сталіцы. У 2019 годзе ўладальнікі электрамабіляў змогуць бесперашкодна перасякаць тэрыторыю Беларусі па ўсіх напрамках асноўных аўтамагістраляў, а да 2024 года кампанія пакрые краіну разгалінаванай электразараднай сеткай, забяспечыўшы транзіт электратранспарту па беларускіх дарогах».

КАРАТКА

• Пасяджэнне Савета міністраў унутраных спраў СНД пройдзе 19—21 ліпеня ў Баку.

• **Міністэрства інфармацыі Беларусі абмежавала доступ да 12 інтэрнэт-рэсурсаў за распаўсюджванне інфармацыі аб продажы наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў.**

• Камітэт міністраў Савета Еўропы падоўжыў Белавежскай пушчы Еўрапейскі дыплом для ахоўных тэрыторый на 10 гадоў.



• **Гродзенскія пагранічнікі за тыдзень затрымалі амаль тры дзясяткі парушальнікаў граніцы.**

ISSN 1990 - 763X

З ЦЕПЛЫНЁЙ ДА КОЖНАГА

Аляксандр Лукашэнка ўручае спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» спявачцы Розе Рымбаевай.

На «Славянскім базары» заўсёды пануе ўнікальная атмасфера міжнацыянальнай дружбы

Аб гэтым гаварыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на цырымоніі адкрыцця XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Ён дадаў, што такое сяброўства існуе па-за дзяржаўнымі межамі, па-за палітычнымі і рэлігійнымі поглядамі і перакананнямі, а сам фестываль служыць самым высакародным мэтам.

«З году ў год наш «Славянскі базар» напаўняе летняе жыццё гэтага славянскага горада Віцебска музычнымі рытмамі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Ператварае пейзажы горада над Дзвіной у вялікую творчую майстэрню, дзе мастакі адкрываюць для нас свет старажытных і сучасных традыцый народнага мастацтва».

Паводле яго слоў, мінулае і сучаснае не толькі ў культуры, але і ў лёсе людзей сплятаюцца тут разам, робяць гэтую падзею блізкай для ўсіх, хто разумее прыроду духоўнай роднасці, ведае свае карані і шануе нацыянальную спадчыну.

СТАР. 2

Фота БелТА.

■ Дары лесу

«ЗА ДВА ТЫДНІ ЗАРАБІЎ 1400 РУБЛЁЎ»

Як працуюць нарыхтоўшчыкі чарніц у сезон

«Сплю па пяць гадзін на суткі. Максімум. Мінулай ноччу толькі тры з паловай паспаў», — прызнаецца загарэлы Анатоль ГАРБАЦЭВІЧ. Мужчына жыве ў Беразіне і кожнае лета працуе нарыхтоўшчыкам. Уладкоўваецца па дагаворы падраду ў райспажыўтаварыства і ездзіць па вёсках скупляць у людзей ягады і грыбы. Цяпер тавар нумар адзін — чарніцы. Па якой цане іх прымаюць сёлета, ці шмат можна зарабіць на дарах лесу і куды прадаюцца беларускія чарніцы — у нашым рэпартажы.

Машыны кааперацыі чакаюць людзей на выхадзе з лесу.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ураджайны год

На чырвоным бусе Анатоль аб'язджае раён. Маршрут на сёння — 120 кіламетраў. Яшчэ ў шэсць раніцы завёз зборшчыкаў у лес пад вёскай Гацец, у гадзіну паедзе забіраць. «Таксуе» бясплатна, але з умовай, што ягады здадуць яму. Кажа, што за гэты час людзі па 15—16 кілаграм чарніц у вёдрах выносяць.

— Мы нашых зборшчыкаў цэнім і аберагаем. Нарыхтоўшчыкаў жа шмат — людзі могуць да іншых пайсці, — заўважае Анатоль. І ўспамінае, як аднойчы вяскоўцам маскітныя сеткі купляў: столькі мошак у лесе развялося, што не было паратунку.

СТАР. 4

З ЦЕПЛЫНЁЙ ДА КОЖНАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускі лідар падкрэсліў: невыпадкова гісторыя фестывалю пачалася тады, калі завяршылася палітычнае жыццё дзяржавы, якая дзесяцігоддзямі аб'ядноўвала многія народы ў адну сям'ю. «І там, дзе палітыкі правялі дзяржаўныя межы, людзі знайшлі самы просты, стагоддзямі праверaны спосаб захаваць добрыя, зараз ужо суседскія адносіны — праз культурныя сувязі», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на той факт, што на віцебскай зямлі зарадзілася традыцыя, якая зноў змацавала славянскі свет мелодыяй любімых песень, гучаннем дзівосных галасоў, паэзіяй і музыкай душы вядомых усім аўтараў і выканаўцаў. Адзінства, давер і ўзаемная падтрымка народаў сталі сапраўднай апорай у станаўленні і развіцці маладых суверэнных дзяржаў.

На думку Прэзідэнта, міжнародны конкурс не толькі сабраў разам блізкіх людзей, але і прыцягнуў увагу таленавітых артыстаў з іншых куткоў зямнога шара. Ён нагадаў гледачам, што прадстаўнікі многіх краін з розных кантынентаў у розныя гады ўпрыгожвалі музычны марафон і напаўнялі яго глыбокім сэнсам.

Паводле слоў беларускага лідара, жыццесцвярджальная ідэя «праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», закладзеная ў канцэпцыю «Славянскага базару» ў год яго заснавання, і сёння застаецца вельмі актуальнай і сучаснай.

Таксама Прэзідэнт нагадаў прысутным, што гэты форум сабраў у Віцебску прадстаўнікоў больш як сарака краін. Акрамя найбліжэйшых суседзяў, у Беларусь прыехалі госці з Вялікабрытаніі, Канады, Паўночнай Карэі, Егіпта, Калумбіі і Гвінеі — гэта пацвярджае душэўную шчодрасць беларусаў, талерантнасць славянскіх народаў, гасцінных і адкрытых для дружбы з усім светам, дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Таму рады сустракаць замежных гасцей, прымаць у сваю вялікую фестывальную сям'ю ўсіх, хто едзе да нас з чыстымі думкамі і добрымі намерамі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І мы шчаслівыя, што з кожным годам такіх людзей становіцца больш, а іх знаёмства з нашай краінай працягваецца таксама ў іншых гарадах і рэгіёнах».

Дарэчы, гэты год для фестывалю юбілейны: ужо трыццаць гадоў віцебскі амфітэатр упрыгожвае горад. Ён прыняў першыя канцэрты «Славянскага базару» — і ўжо не злічыць, колькі песень з тых часоў прагучала, колькі зорак эстрады і гледачоў у ім сустрэлася.

На думку Прэзідэнта, галоўная канцэртная пляцоўка форуму стала для многіх артыстаў родным домам, месцам, дзе заўсёды ўтульна адчуваюць сябе ўсе — і сталыя госці, ужо вядомыя выканаўцы, і дэбютанты.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што глядач цёпла сустрэне кожнага маладога выканаўцу, журы будзе аб'ектыўным і добразычлівым і грамадскасць стане сведкам нараджэння новых імёнаў. Беларускі лідар таксама павіншаваў усіх са святам, якое дорыць усім прыгажосць мастацтва, радасць сяброўскіх зносін і пачуццё паўнаты жыцця.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка аб'явіў XXVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» адкрытым.

Узнагароды знайшлі сваіх герояў

Кіраўнік дзяржавы ўручыў прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2017—2018 гады. Трыумфатарамі сталі народны артыст Савецкага Саюза балетмайстар Валянцін Елізар'еў, народны артыст Расіі кампазітар Алег Іваноў, аўтарскі калектыў у складзе народнага артыста Расіі дырыжора Валерыя Палянскага і заслужанага работніка культуры Расіі Аляксандра Шаніна.

Спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» з рук Прэзідэнта атрымала спявачка Роза Рымбаева. Паводле яе слоў, гэты прыз — прызнанне не толькі яе творчасці, але і павага да мастацтва Казахстана і ўсёй краіны.

Уладальнікам Гран-пры XVI Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2018» стаў Аляксандр Балабанаў з Украіны.

Не застаўся без узнагароды і сам Аляксандр Лукашэнка — яму падарылі пояс-абярэг. Так арганізатары падзякавалі беларускаму лідару за тое, што ў свой час ён спрыяў захаванню фестывалю.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Дзённік фестывалю

ГРАН-ПРЫ — ЮНАМУ ЎКРАІНЦУ

«Базарная сенсацыя»: у дзень урачыстага адкрыцця Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» не было дажджу! Так супала, што менавіта ў чаканні старту фэсту нябёсы быццам бы бласлаўлялі яго.

Але а трэцяй гадзіне дня ў пятніцу першы пасля адкрыцця «Базару» дождж усё ж такі пайшоў!

27-ы «Базар» традыцыйна ў гэтыя дні — культурная падзея № 1 на постсавецкай прасторы. Ён ўпэўнена

Фота БелТА

«ўзяў у палон» гараджан, удзельнікаў і шматлікіх турыстаў. Усе яны жывуць па «Базарных законах», згодна з якімі ў Віцебску вядуць рэй радасць і вяселле. Цікавыя мерапрыемствы праходзяць з раніцы да ночы.

Дарэчы, адно з іх ужо завяршылася. Гаворка ідзе аб дзіцячым конкурсе выканаўцаў. Яго выйграў дванаццацігадовы прадстаўнік Украіны Саша Балабанаў *(на фота)*.

У выхадныя святочны марафон працягваецца і тэмп не зніжаецца.

Сёння, 14 ліпеня, у фестывальным горадзе праходзіць Дзень моладзі. У праграме фэсты «Агонь танца», субкультур і здаровага ладу жыцця. Эпіцэнтрам святкавання стане галоўная гарадская плошча — Перамогі.

У Віцебскай абласной філармоніі можна будзе ўбачыць унікальную праграму «Шоу трох раяляў». Працягваецца фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». У летнім амфітэатры адбудзецца юбілейны канцэрт кампазітара Аляксандра Марозава. Ёсць і не меней цікавыя канцэрты, шоу, выстаўкі.

Заўтра, 15 ліпеня, у канцэртнай зале «Віцебск» пройдзе юбілейны канцэрт кампазітара Ігара Лучанка. Як і ў мінулыя гады, адбудзецца гала-канцэрт майстроў мастацтваў Ізраіля. У ноч на 16 ліпеня ўпершыню на «Базары» выступае кумір падлеткаў рэпер Цімаці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ЦІКАВАЯ І САМАБЫТНАЯ ТОЛЬКІ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА»

Лаўрэаты прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва назаўтра пасля ўручэння высокіх узнагарод сустрэліся з журналістамі.

— Як вы ставіцеся да сучаснай творчай моладзі, чым яна радуе, а чым, магчыма, засмучае і якія захады варта яшчэ зрабіць, каб дазволіць самарэалізавацца таленавітым маладым людзям? — запыталася «Звязда» ў лаўрэатаў.

— На мой погляд, трэба даць магчымасць моладзі часцей чуць добрую музыку, у тым ліку класічную, каб выхоўваць густ, — лічыць **дырыжор Валерый ПАЛЯНСКІ.** — Тым больш што такая патрэба, безумоўна, ёсць, мяркуючы па тым, колькі маладой публікі я бачу на розных канцэртах: оперных, камерных, сімфанічнай музыкі.

— Сённяшняя моладзь, канешне, зусім іншая, чым трыццаць гадоў таму. Я магу сказаць па сваім сыне, якому 23, — у яго зусім іншыя інтарэсы, у тым ліку музычныя. Штосьці з гэтых песень падабаецца і мне, а штосьці я катэгарычна не прымаю, — дзеліцца **кампазітар Алег ІВАНОЎ.** — Асабліва тое, што часта даводзіцца бачыць, — другаснасць, прыпадабненне да чужых стыляў, напрыклад да амерыканскіх субкультур. Таму мая парада маладым творцам — падбіраць для сваіх песень словы простыя, блізкія і зразумелыя слухачам, адштурхоўвацца ад добрай мелодыі. А яна, у сваю чаргу, — я ўпэўнены ў гэтым, — мусіць грунтавацца на народнай традыцыі. Цікавая і самабытная толькі нацыянальная культура і нацыянальная мова — руская, беларуская, украінская, армянская — тая, у якой ты жывеш.

— Я падтрымаю калег у тым плане, што найперш у моладзі трэба развіваць добры густ, а для гэтага не абмяжоўвацца адной толькі папулярнай музыкай, шмат глядзець і слухаць, параўноўваць, — дадае **балетмайстар Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ.** — На жаль, часта даводзіцца бачыць, у тым ліку і на сцэне «Славянскага базару», такія выступленні, якія, на мой погляд, не дацягваюць па мастацкім узроўні да міжнароднага фэсту. І каб была мая воля, я іх скараціў бы ўдвая ці нават больш. Гэта не значыць, што я супраць творчых эксперыментаў: у нас хапае таленавітай моладзі, якая шукае і прапаноўвае нешта новае. Аднак пэўную мастацкую планку трэба трымаць.

У ВІЦЕБСК ПРЫЕХАЛІ ВАЛАГОДСКІЯ КАРУНКІ

Развіццё міждзяржаўных культурных адносін Беларусі і Расіі, падтрымка дзеячаў культуры і мастацтваў, праектаў у навукова-тэарэтычнай і навукова-практычнай сферы маюць сістэмны характар. Гэта адзначыў намеснік дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Мікалай КОРБУТ падчас прэс-канферэнцыі на XXVII «Славянскім базары ў Віцебску».

Сёлета Дзень Саюзнай дзяржавы, які ладзіцца на мастацкім форуме ўжо 15 гадоў, прайшоў з акцэнтам на міжкультурнае рэгіянальнае супрацоўніцтва дзвюх краін. Так, 13 ліпеня ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстаўка экспанатаў Валагодскага музея карункаў, а на пляцоўцы перад музеем прайшоў адмысловы модны паказ, у якім узялі ўдзел як беларускія дызайнеры, так і майстры Валагодскай карункавай фабрыкі. У Музеі-сядзібе І. Рэпіна «Здраўнёва» сваю экспазіцыю прадставіў расійскі музей-сядзіба «Пенаты» (пасёлак Рэпіна пад Санкт-Пецярбургам), а прадстаўнікі беларускіх і расійскіх музеяў абмеркавалі стан і перспектывы міжкультурнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Увечары ж госці фестывалю адкрылі для сябе шэраг новых імёнаў у канцэрце «Саюзная дзяржава запрашае...».

«Мне здаецца, ёсць добрая перспектыва яшчэ шырэй прадставіць Саюзную дзяржаву на мастацкім форуме ў Віцебску, — заўважыў **намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Аляксандр СЯГОДНІК.** — Напрыклад, для конкурсу выканаўцаў эстраднай песні можна правесці дадатковы адбор выканаўцы, які прадстаўляў бы Саюзную дзяржаву. Таксама варта было б прадставіць у Віцебску адмысловую маладзёжную канцэртную праграму з удзельнікамі нашых фестываляў «Творчасць юных», які праходзіць у Анапе, і «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», які ладзіцца ў Растове-на-Доне».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СМІ: УКРАІНА ПЛАЦІЛА ГРОШЫ Ў ЗША, КАБ ДЫСКРЭДЫТАВАЦЬ «ПАЎНОЧНЫ ПАТОК — 2»

Украінскія дзяржаўныя кампаніі, у тым ліку «Нафтагаз Украіны», патрацілі амаль чвэрць мільёна долараў за паўгода на дыскрэдытацыю газаправода «Паўночны паток — 2». Пра гэта гаворыцца ў справаздачы кампаніі Yorktown Solutions, на якую спасылалася ў пятніцу ўкраінскае выданне «Страна».

Па даных выдання, пра кантракт «Нафтагаза» з амерыканскімі лабістамі стала вядома яшчэ ў 2017 годзе. Ва ўкраінскай кампаніі назвалі такую меру рэакцыяй у адказ на «інтэнсіфікацыю лабісцкай кампаніі «Газпрама».

«Паўночны паток — 2» — праект газаправода паміж Расіяй і Германіяй, які будзе пракладзены па дне Балтыйскага мора. Сукупная магутнасць праекта ацэньваецца ў 55 млрд кубаметраў газу ў год. Запуск газаправода запланаваны на канец 2019 года.

БОЛЬШАСЦЬ АМЕРЫКАНЦАЎ ЛІЧЫЦЬ, ШТО САМІТ У ХЕЛЬСІНКІ БУДЗЕ ПАСПЯХОВЫМ ДЛЯ ПУЦІНА

Больш за палову амерыканцаў (59 працэнтаў) мяркуе, што прэзідэнту ЗША Дональду Трампу варта сустрэцца з кіраўніком расійскай дзяржавы Уладзімірам Пуціным. Пры гэтым, на думку большасці рэспандэнтаў, вынікі саміту будуць больш выгаднымі для Масквы. Пра гэта сведчаць апублікаваныя вынікі апытання грамадскай думкі, праведзенага 9—11 ліпеня тэлеканалам Fox News.

Удзельнікаў даследавання таксама спыталі аб тым, ці дастаткова жорсткі курс праводзіць адміністрацыя Трампа ў дачыненні да Расіі. 5 % апытаных мяркуюць, што «празмерна жорсткі», а 53 % — што «недастаткова жорсткі».

Сустрэча Трампа і Пуціна пройдзе 16 ліпеня ў Хельсінкі.

ЗОРКІ ГАЛІВУДА САБРАЛІСЯ Ў КОСМАС

Амерыканская прыватная аэракасмічная кампанія Blue Origin плануе прадаваць турыстам месцы на сваім караблі New Shepard для субарбітальных палётаў па кошце ад $200 тыс. да $300 тыс., паведамляе ТАСС.

Карабель New Shepard зможа браць на борт шэсць пасажыраў. Першымі пасажырамі карабля стануць супрацоўнікі Blue Origin, аднак да іх адбору кампанія яшчэ не прыступала. Паводле ацэнак экспертаў, кожны палёт на арбіту будзе абыходзіцца ў $10 млн, так што Blue Origin панясе страты, па меншай меры на першапачатковым этапе.

Акрамя Blue Origin рэгулярныя турыстычныя палёты ў космас плануюць таксама ажыццяўляць кампаніі Virgin Galactic і SpaceX. Так, Virgin Galactic у канцы мая правяла ўжо 13-е па ліку выпрабаванне свайго карабля. Чакаецца, што кошт двухгадзіннага палёту, падчас якога шэсць пасажыраў змогуць убачыць Зямлю з вышыні 100 км, складзе каля $250 тысяч. Сярод тых, хто хоча адправіцца на арбіту на гэтым караблі, ёсць галівудскія зоркі Леанарда Дзі Капрыа, Том Хэнкс і Анджэліна Джалі.

■ Блізкая ўлада

КАЛІ КАРЫСЦЬ — АГУЛЬНАЯ

З якімі пытаннямі прыйшлі на прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай грамадзяне ў Лепелі

Са сваімі праблемамі звярнуліся не толькі жыхары Віцебскага рэгіёна, але і Магілёўскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

У час размовы з журналістамі Наталля Качанава адзначыла, што пытанняў паступіла шмат і ўсе яны разнапланавыя: ад жыллёвых праблем да пытанняў адукацыі. «Выязныя прыёмы даюць магчымасць даведацца, што адбываецца ў рэгіёне, якія праблемы існуюць у жыхароў. Такія сустрэчы паказваюць пэўны зрэз у якасці работы мясцовай улады са зваротамі грамадзян. Парадавала, што людзі прыходзяць не толькі па сваіх прыватных пытаннях, але і імкнуцца нешта зрабіць дзеля агульнага дабра, выказваюць прапановы, як развіваць той ці іншы населены пункт, асабліва, дзе яны нарадзіліся», — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Так, жыхар Смаргоні расказаў пра адсутнасць парадку на некаторых масавых пахаваннях салдат Першай сусветнай вайны. Ён займаецца гістарычнай рэканструкцыяй і пры яго дапамозе ўдалося стварыць турыстычны аб'ект «Залатая горка» (узвышэнне, дзе падчас Першай сусветнай вайны знаходзіўся нямецкі назіральны пункт). Такія месцы дапамагаюць захоўваць гістарычную памяць народа і прыцягваюць турыстаў з розных краін.

Жыхарка самага маленькага горада Беларусі Дзісны Мёрскага раёна, якая прыехала на прыём, выказала некалькі ідэй аб развіцці вытворчасці ў рэгіёне, каб людзі не з'язджалі з роднага краю. Наталля Качанава адзначыла, што зверне ўвагу абласных улад на Дзісну.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама акцэнтавала ўвагу на важнасці таго, як увасабляюцца ў жыццё розныя праграмы, планы і законы на месцах. «Вядома, падымаліся пытанні, якія мясцовыя ўлады павінны аператыўна вырашаць і не змушаць людзей запісвацца на прыём кіруючых асоб рэгіянальнага або рэспубліканскага ўзроўню. Праблемы неабходна вырашаць аператыўна, у першую чаргу — тыя, што датычацца пытанняў навядзення парадку на зямлі, добраўпарадкавання, тое, пра што кажам у Год малой радзімы асабліва. Гэтыя задачы ставіў і кіраўнік дзяржавы. Безумоўна, нейкія пытанні адразу немагчыма вырашыць з-за пэўных абставін, але выпадкаў, калі праблемы людзей адкладваюцца надоўга, быць не павінна», — сказала Наталля Качанава.

На прыёме ў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта было агучана каля 40 пытанняў, некаторыя звароты былі калектыўнымі. Усе пытанні ўзятыя на кантроль

■

■ Рэкорды прыёмнай кампаніі

«Падрыхтавалася трошкі лепш за іншых»

Выпускніца пінскай гімназіі паступае ў БДУ з 400 баламі

Пакуль абітурыенты вывучаюць прахадныя балы на спецыяльнасці і прыкідваюць, на што хопіць іх вынікаў, выпускніца пінскай гімназіі № 3 Настасся ЖАЎНЕРЫК ведае дакладна: паступіла. У суме дзяўчына набрала 400 балаў!

У яе скарбонцы — па сотні за ЦТ па грамадазнаўстве і англійскай мове, залаты медаль і дыплом рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове. «У прыёмнай камісіі БДУ вельмі здзівіліся, калі ўбачылі мае балы. Спыталі, чаму на тэлебачанні мяне яшчэ не паказвалі. Адказала, што тэлебачанне, мабыць, не даехала да Пінска», — жартуе абітурыентка.

Рыхтавацца да ЦТ пінская школьніца пачала за год. Займалася з рэпетытарамі — па два двухгадзінныя заняткі на тыдзень па кожным прадмеце.

— Думаю, магла б і сама, але, калі ёсць кантроль збоку, гэта заўсёды лепш. Ты разумееш, што, калі прыйдзеш да настаўніка непадрыхтаваным, будзе няёмка. Плюс яны даюць больш ведаў, чым у школе. Напрыклад, школьная праграма па англійскай мове не зусім супадае з тым, што падаецца ў ЦТ. Яшчэ я набывала падручнікі з тэстамі, рашала іх. Як і ўсе. Але так атрымалася, што падрыхтавалася трошкі лепш за іншых, — сціпла расказвае Настасся.

Дзяўчына падлічвае: разам на вывучэнне англійскай мовы і грамадазнаўства траціла гадзін 16 на тыдзень. У прыёмнай камісіі яе нават пашкадавалі: маўляў, ніякага асабістага жыцця. «Але яно было! — пераконвае суразмоўніца. — Я гуляла з сябрамі, хадзіла ў кіно, чытала, спала. Сон — гэта вельмі важна».

Першымі з'явіліся вынікі па грамадазнаўстве. Насця тады была дома, але глядзець балы баялася — папрасіла малодшага брата. Калі пачула пра сотню, не паверыла: ведала, што гэта магчыма, але не ў яе выпадку. А бацькі прызналіся: так і думалі, што дачка здасць тэсты на выдатна. Вынікі па англійскай мове дзяўчына ўбачыла, калі ехала ў аўтобусе. Ад радасці крычала так, што ўсе пасажыры азіраліся. Пінчанка, дарэчы, пісала ЦТ па яшчэ адным прадмеце — гісторыі Беларусі. На ўсякі выпадак. Набрала 79 балаў. «Але я мэтанакіравана не рыхтавалася», — кідае незнарок.

З алімпіядай па беларускай мове таксама склалася як ніколі ўдала. На абласны этап школьніца трапіла толькі ў гэтым годзе. Не хавае: нават не думала, што выйдзе на рэспубліку. А калі выйшла, зрабіла ўсё магчымае, каб атрымаць 100 балаў для паступлення.

Бацькі дзяўчыны працуюць у Пінскім аўтобусным парку. Мама — касір, тата — вядучы спецыяліст аддзела маркетынгу. Але Насця выбрала іншы шлях. Падала дакументы на факультэт міжнародных адносін БДУ. Спецыяльнасць — «міжнародныя адносіны». «Сябар параіў. Я пачытала пра факультэт, з'ездзіла на дзень адчыненых дзвярэй, паслухала выкладчыкаў. Прахадныя балы вельмі высокія — для мяне гэта гаворыць аб тым, што спецыяльнасць прэстыжная. Ёсць перспектыва стаць дыпламатам ці міністрам замежных спраў, чаму не?» — смяецца.

Запасны варыянт, вядома, быў — юрфак Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце або МДЛУ (бо ёсць здольнасці да вывучэння замежных моў). Але ў выніку ўсё склалася па плане А.

Тым, хто будзе рыхтавацца да паступлення ў наступным годзе, Настасся раіць правільна размяркоўваць свае сілы.

— Не трэба з самага пачатку ўвесь час аддаваць прадметам. Бо калі сядзець 24 гадзіны на суткі і вывучаць адно і тое ж, гэта хутка абрыдне і ты не зможаш глядзець на падручнікі. Усё трэба рабіць паступова. А потым на ЦТ максімальна сканцэнтравацца. І не хвалявацца — інакш да 90 балаў не дацягнеш.

У ліпені дзяўчына плануе адпачываць дома. А ў жніўні збіраецца ў лагер «Блік», на спецыялізаваную змену для тых, хто гуляе ў «Што? Дзе? Калі?». «Гэта мой любімы лагер», — прызнаецца дзяўчына і шкадуе, што ў гэты школьны летнік паедзе ў апошні раз.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

«ЗЯЛЁНЫЯ» ПРАЕКТЫ НАВАГРУДЧЫНЫ

Вучэбна-кансультацыйны цэнтр па аднаўляльных крыніцах энергіі ў Навагрудскім аграрным каледжы, сістэма гарачага водазабеспячэння на сонечнай энергіі ў цэнтральнай раённай бальніцы і новая ветрастанцыя ў вёсцы Грабнікі. Тры новыя аб'екты ў адзін дзень з'явіліся ў раёне дзякуючы праекту «Развіццё аднаўляльных крыніц энергіі ў Навагрудскім раёне — Дарожная карта для экалагічна чыстай тэрыторыі».

Навагрудак — унікальнае па сваіх прыродна-кліматычных умовах месца. Таму аднаўляльная энергетыка — асаблівасць краю, яго іміджавы складнік, заўважыў на ўрачыстым адкрыцці ветрастанцыі **Анатоль МАРКЕВІЧ, старшыня Навагрудскага райвыканкама.**

Вятрак магутнасцю 2,5 МВт — гэта ўстаноўка 100-метровай вышыні з 50-метровымі лопасцямі — з'явіўся дзякуючы падтрымцы Еўрапейскага саюза ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.

Андрэа ВІКТАРЫН, пасол Еўрапейскага саюза ў Беларусі, адзначыла фінансавую карысць, якую прынясе работа ўстаноўкі вучэбнаму цэнтру Міністэрства прыроды, што дазволіць яму распрацоўваць дадатковыя вучэбныя праграмы і даваць магчымасці для падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

Сёння на Навагрудчыне працуе амаль не палова ўсіх ветраўстановак Беларусі (20 з 50). Агульная магутнасць ветракоў раёна — 32 МВт.

Ірына СІДАРОК.

НАШЫ РЭЗЕРВЫ — 6,8 млрд ДОЛАРАЎ

Па стане на 1 ліпеня міжнародныя рэзервовыя актывы краіны склалі 6 млрд 831,4 млн долараў (у эквіваленце). За чэрвень золатавалютныя рэзервы знізіліся на 108,2 млн долараў (на 1,6 працэнта) пасля скарачэння ў маі на 98,5 млн долараў (на 1,4 працэнта).

Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках чэрвеня тлумачыцца планавым пагашэннем Нацбанкам і ўрадам краіны ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля 424 млн долараў, а таксама зніжэннем кошту манетарнага золата.

Падтрыманню ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў у чэрвені спрыялі купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, паступленне сродкаў ад продажу на ўнутраным рынку Нацбанкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце.

Сяргей КУРКАЧ.

ДВАЙНОЕ «РЭХА ВАЙНЫ»

Чыгуначны мост у Аршанскім раёне сапёрам прыйшлося размініраваць двойчы.

Падчас рамонтных работ на перагоне Орша — Чэрвіна, зняўшы частку верхняга палатна, рабочыя ўбачылі трацілавыя шашкі. Выклікалі сапёраў. Яны дасталі з-пад зямлі 54 боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны. Іх знішчылі ў бяспечным месцы.

На наступны дзень, як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік вайсковай часці 5524 Марыя ВАРАБ'ЁВА,** сапёраў зноў выклікалі туды ж, бо працягнуўшы рамонт, зноў наткнуліся на «рэха вайны».

Сапёрна-піратэхнічны разлік пад камандаваннем старшага прапаршчыка Віталя Ігнаціка на гэты раз дастаў 99 трацілавых шашак.

— На месца выехалі ў 10 гадзін раніцы, а каля трох дня перадалі інфармацыю пра тое, што ўсё неабходнае было зроблена, — удакладніла Марыя Вараб'ёва.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ЗА ДВА ТЫДНІ ЗАРАБІЎ 1400 РУБЛЁЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Канкурэнцыя сапраўды вялікая. У тым жа Беразіне, акрамя сваіх, працуюць нарыхтоўшчыкі з іншых раёнаў — Бабруйскага, Бялыніцкага, Быхаўскага. «У іх больш брудныя зоны, вось і едуць да нас, — тлумачыць мужчына. — Хоць і тут ёсць мясціны, дзе ягады «фаняць». Напрыклад, вёска Жарамец — у жыцці туды не паеду. Там заўсёды была радыяцыя, яшчэ ў 1990-х».

Справа даходная, таму ўладкавацца спрабуюць многія. Але бяруць не ўсіх. У райспажыўтаварыстве агучваюць крытэрыі: нарыхтоўшчыкі мусяць быць прыстойнымі, непітушчымі.

Нарыхтоўшчык Анатоль ГАРБАЦЭВІЧ разлічваецца за ягады.

Нарыхтоўшчыкам Анатоль працуе гадоў 20. Раней займаўся ўстаноўкай камер відэаназірання, потым быў у ахове ў міліцыі. Але на нарыхтоўках, кажа, заробак большы.

— Мы пачынаем з чэрвеня і заканчваем практычна ў лістападзе. Ужо першыя замаразкі, снег падае, а мы з журавінамі разбіраемся. Хутка грыбы пойдуць — буду імі займацца. Баравічкамі, апенькамі, груздамі. Сёлета, думаю, сезон будзе ўдалы, багаты, — мяркуе Анатоль. Мінулы год, уздыхае ён, выдаўся зусім неўраджайны, мужчына нарыхтоўваў 700 кілаграмаў ягад у тыдзень. А сёлета за два тыдні здаў больш за шэсць тон! Заробак за гэты час — 1400 рублёў. Але і работы шмат. «Сястра з Мінска, якая на пенсіі, прыязджае дапамагаць, маці таксама, бо я не паспяваю».

Грошай, атрыманых за сезон, хапае, каб спакойна пражыць да наступнага лета. Яшчэ і ў будоўлю дома частку ўкласці.

Жартуем: напэўна, Анатоль ужо гляджець не можа на тыя ягады?

— Наадварот, чарніцы вельмі люблю, але няма часу іх есці. Толькі калі прыязджаю ў райспажыўтаварыства здаваць іх, магу пакаштаваць са скрыні. Апошні раз там быў два дні таму.

У ягадах — уся вёска

Мужчына заязджае ў вёску Жорнаўка. Каля машыны хутка з'яўляюцца вяскоўцы з ягадамі. Муж і жонка Леанід і Яўгенія Калатухіны, напрыклад, ходзяць у лес штодня.

— Якраз водпуск бяром на ягады, — расказваюць. — Але сёння нядоўга ў лесе былі, з 6 да 8.30 раніцы, нямнога назбіралі.

Вёдры заважылі на сем кіло. Закупачны кошт на чарніцы — 3,50 рубля. А значыць плюс 24,5 рубля ў сямейны бюджэт. Грошы звычайна ідуць на корм скаціне (у Калатухіных вялікая гаспадарка) і на тое, каб сабраць дзяцей у школу.

— Мы ў турцэнтры ў Беразіне працуем, муж — рабочым па абслугоўванні, я — прыбіральшчыцай. У мяне заробак 300 рублёў. На ягадах магу ў два разы больш атрымаць. Пакуль ёсць чарніцы, можна месяц жыць нябедна, — дзеліцца Яўгенія.

— Галоўнае — не ленавацца. А ўраджай сёлета добры: кусты пад цяжарам ягад на зямлі ляжаць, — дадае Леанід.

— Ды ўся вёска практычна цяпер у лесе! Каму грошы патрэбныя, заўсёды ходзяць. У асноўным моладзь чарніцы збірае, — падмячае жанчына.

У дзень Анатолю здаюць ягады да ста чалавек. Мужчына расказвае, што часта падзарабляюць настаўнікі. «У дзень па 50—60 рублёў маюць. А як у гэтым годзе чарніц шмат, за месяц людзі могуць атрымаць па дзве-тры тысячы рублёў — сур'ёзна!»

Планы на экспарт

Усяго ў Бярэзінскай кааперацыі працуе 12 нарыхтоўчых перасоўных пунктаў.

— Зручна. Выдаткі мінімальныя, — адзначае **намеснік старшыні райспажыўтаварыства па нарыхтоўках, прамысловасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Віктар ГРУЗД.** — Калі напрыклад, сельская крама, якая за 30 кіламетраў, ягады прымае, дык трэба ж паспець іх яшчэ забраць у сховішча. А тут нарыхтоўшчыкі самі прывозяць.

Канкурэнцыя сапраўды вялікая. У тым жа Беразіне, акрамя сваіх, працуюць нарыхтоўшчыкі з іншых раёнаў — Бабруйскага, Бялыніцкага, Быхаўскага.

Ім, у сваю чаргу, кампенсуюць транспартныя расходы і дадаюць па шэсць капеек з кожнага кілаграма здадзеных чарніц. Справа даходная, таму ўладкавацца спрабуюць многія. Але бяруць не ўсіх. У райспажыўтаварыстве агучваюць крытэрыі: нарыхтоўшчыкі мусяць быць прыстойнымі, непітушчымі. «Удакладняем усю паднаготную пра іх. Важна, каб і з насельніцтвам ветліва працавалі. Гэта нашы падначаленыя, мы за іх адказваем».

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Чарніцы для вяскоўцаў — добрая падмога.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

➢ Мінскі аблспажыўсаюз павялічыў нарыхтоўку чарніц у шэсць разоў у параўнанні з мінулым годам. Сёлета закупілі ўжо 270 тон ягад (супраць леташніх 44 тон). Аб'ём павялічыўся дзякуючы спрыяльным умовам надвор'я. Найбольшы ўклад унеслі Любанскі (49 тон чарніц), Салігорскі (36 тон), Бярэзінскі (30 тон), Лагойскі (25 тон) і Старадарожскі (21 тона) раёны.

➢ Усяго ў вобласці працуе каля 180 нарыхтоўшчыкаў. Закупачны кошт вагаецца ад 3,5 да 4,5 рубля за кілаграм.

➢ Акрамя чарніц, прымаюць і садовыя ягады: маліны, вішні, чырвоныя і чорныя парэчкі. Так, кааперацыі вобласці нарыхтавалі ўжо 36 тон чорных парэчак і 40 тон чырвоных. Прыём клубніц у рэгіёне ўжо завяршыўся: сабрана 133 тоны.

Цэны на чарніцы сёлета высокія, лічыць Віктар Грузд. Калі прымалі па тры рублі, вяскоўцы не надта актыўна здавалі. А ў некаторых раёнах Міншчыны, у тым жа Клецкім і Капыльскім, людзям прапануюць па чатыры рублі за кіло: лясоў там мала, таму і ягада цэніцца.

Нарыхтаваныя чарніцы загружаюць у «халадзільнік» — памяшканне з тэмпературай мінус 24 градусы. Пры глыбокай замарозцы яны захоўваюцца восем месяцаў. Практычна ўсё потым пойдзе на экспарт — у Польшчу і Літву.

— Цяпер ёсць кантракты па 2,3 еўра за кілаграм. Але цана будзе расці. Мінулы год быў неўраджайны, усе засекі распрадалі. А да канца года чарніцы яшчэ даражэйшыя стануць, — прагназуе Віктар Грузд.

Замежныя скупшчыкі пасля ачышчаюць прадукцыю ад лісця, аддзяляюць буйныя ягады ад дробных і прадаюць у Іспанію ці Францыю ўжо па 5 еўра за кіло. На пытанне, чаму б адразу не рабіць гэта ў нас, у кааперацыі тлумачаць: устаноўка такой сартавальнай сістэмы вельмі дарагая. У Глуску, напрыклад, яна ёсць — пабудавалі гадоў 10 таму. Там па транспарцёрнай стужцы едуць чарніцы, прадзімаюцца ад смецця і адразу замарожваюцца. Такія ягады пасля на працэнтаў 15—20 даражэй прадаюцца.

Бярэзінскі раён лічыцца рэсурсным па чарніцах. Але летась праз замаразкі за сезон райспажыўтаварыства нарыхтавала ўсяго шэсць тон гэтых ягад. Сітуацыя сёлета адназначна больш спрыяльная.

— На сёння мы закупілі 30 тон чарніц і яшчэ столькі ж дакладна будзе, — дзеліцца планамі намеснік старшыні. — Галоўнае — выканаць заданне, атрымаць вялікі прыбытак для райспажыўтаварыства і зрабіць план па экспарце.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Бярэзінскі раён.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инвентарный номер № 441/С–13358 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание сепараторного отделения Юратишки), площадью 300,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. п. Юратишки, ул. Первомайская, д. 18, с составными частями и принадлежностями: железобетонная градирня – инв. № 2055; здание склада сепараторного отделения Юратишки бревенчатое – инв. № 1004; здание сепараторного отделения Юратишки кирпичное – инв. № 1005; ограждение – металлическая штамповка на металлических столбах – инв. № 2078; двое ворот металлических на металлических столбах – инв. № 2061, инв. № 2062; емкость металлическая 25 тонн для нефтепродуктов – инв. № 4010; дымовая труба металлическая – инв. № 111828; покрытие асфальтобетонное – инв. № 2001; уборная деревянная – инв. № 1036; фундаменты, обвалование, лестницы под емкость – инв. № 2064; фундамент под танк обрата 10 куб. м – инв. № 2065.
Оборудование: весы электронные платформа 2HFS 1500*1500 нерж. – инв. № 110641; пластинчатый охладитель – инв. № 394; шкаф вытяжной 1000*760*2200 – инв. № 110158; подстанция КТП – инв. № 4007; электроводонагреватель – инв. № 5111; электроводонагреватель – инв. № 5112; стол лабораторный 1000*600*1800 – инв. № 110159; стол лабораторный 1400*600*750 – инв. № 110263; система пожарной сигнализации – инв. № 110758; емкость техническая объемом 1,9 куб. м на опорах – инв. № 110833; многолетние насаждения: береза, 6 шт. – инв. № 9077, 9076; дуб – инв. № 9079; яблоня, 2 шт. – инв. № 9080; ясень, 2 шт. – инв. № 9078

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422955700001000081, (назначение – земельный участок для производственных нужд), площадью 0,6596 га, расположенном по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-он, г. п. Юратишки, ул. Первомайская, д. 18)

Начальная цена продажи – 33 510 руб. (тридцать три тысячи пятьсот десять рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 676 руб. (одна тысяча шестьсот семьдесят шесть рублей)

Лот 2: капитальное строение, инвентарный номер № 420/С–4284 (назначение – здание специализированного назначения, наименование – здание сепараторного отделения), расположенное по адресу: Лидский район, д. Белица. Составные части и принадлежности: здание Белицкого с/о – инв. № 1027; сарай дощатый сепараторного отделения Белица – инв. № 1028; уборная деревянная – инв. № 1038.
Сооружения: ворота с металлической решеткой на металлических столбах – инв. № 2063; ограждение из колючей проволоки – инв. № 2080; ограждение из металлической сетки – инв. № 2054; фундамент под емкость кирпич – инв. № 2067; многолетние насаждения: береза – инв. № 9075; груша, 2 шт. – инв. № 9073, 9074; клен, 2 шт. – инв. № 90121; клен, 32 шт. – инв. № 90171; клен, 4 шт. – инв. № 9069; тополь, – инв. № 9072; тополь, 4 шт. – инв. № 9071; ясень, 6 шт. – инв. № 9070

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423680400621000029, (назначение – для обслуживания Белицкого сепараторного пункта), площадью 0,9094, расположенном по адресу: Гродненская обл., Лидский р-он, д. Белица

Начальная цена продажи – 14 898 руб. (четырнадцать тысяч восемьсот девяносто восемь рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 745 руб. (семьсот сорок пять рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – ОАО «Лидский молочно-консервный комбинат», 231300, Республика Беларусь, Гродненская обл., г. Лида, ул. Энгельса, 116

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 14 августа 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.
Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 8 августа 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Считать недействительным утерянный бланк ЗАСО «ТАСК» внутреннего ОСГО ВВ 1213465

Свидетельство о регистрации частного торгового унитарного предприятия «ОршаОптТорг», УНП 391435800, **считать недействительным** в связи с его утратой.

■ Вандроўкі з сяброўкай

ЗАБАЎКІ КАЛЯ ВЕТРАКА

Інтэрактыўны музей, язычніцтва і незвычайныя стравы

Апынуцца ў мінулым, каб даведацца пра жыццё беларускай шляхты і заняткі нашых продкаў. Прайсці выпрабаванне на гаспадарлівасць і паглядзець, як працуюць каваль і ганчар. Пакаштаваць дамашнія хлеб, масла, сыр, самагон ды бутэрброды з мёдам і салёным агурком. Усё гэта можна зрабіць у інтэрактыўным музеі, дзе экспанаты не хаваюць за шклом, а дазваляюць памацаць, прымерыць і нават пакаштаваць іх. А наведвальнікі не проста слухаюць экскурсавода ды назіраюць за наваколлем, а актыўна ўцягваюцца ў падзеі, якія разгортваюцца ў комплексе старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій Дудуткі.

Пра парог і чарцей

Турыстаў рыхтуюць да сустрэчы з даўніной яшчэ па дарозе. Экскурсавод прадпрыемства «Аўтаматычныя тэхналогіі турызму» натхнёна распавядае пра гісторыю стварэння першага прыватнага музея ў Беларусі, які ў 1994 годзе на месцы былога фальварка заснаваў Яўген Будзінас. За гадзіну цікаўныя даведаюцца пра гістарычных уладальнікаў мястэчка, пачуюць пра абавязкі і прывілеі беларускай шляхты, атрыбутыку іх строяў і прычыны знікнення як класа.

На першы аб'ект комплексу — млын з ветраком вышынёй 14 метраў, які здольны за гадзіну перамалоць 500 кілаграмаў зерня — 10 мяхоў мукі, турысты трапляюць цалкам падрыхтаваныя ўспрымаць і смакаваць мінуўшчыну. І вось яны ўжо слухаюць напаўказку-напаўпраўду пра язычніцкія павер'і ды забабоны, пераступаюць парог на ўваходзе правай нагой, не наступаючы на яго. Круцяць 800-кілаграмовыя жорны і мацаюць старажытную шасцярэньку з грабу. А на выхадзе, каб чэрці, якія жывуць у млыне, грошы не забралі, паказваюць язык ці стукаюць па дрэве.

Правяраюць, ці выйшаў чорт разам з турыстам, у доміку завозніка, дзе падарожнікаў «прымушаюць» есці бутэрброды з салам, цыбуляй і квашанай капустай. Калі каму пахне нясмачна, значыць, нячысцік у яго на плячы. Яшчэ адна з цікавых забаў для турыстаў у хаце — калыска, падвешаная пад столлю. Экскурсавод Ірына запэўнівае, што калі яе пагушкаць, зацяжарыш.

Папрацуеш — пад'ясі

Каб зарабіць далейшыя пачастункі для групы, асобным яе прадстаўнікам давялося папрацаваць. Без гэтага ніяк, заўважыла экскурсавод. Зарабляць на моцны пачастунак давялося жаночай частцы групы. Яны праходзілі выпрабаванне на гаспадарлівасць — расціралі паміж далонямі крыху гарэлкі і ўгадвалі, чым пахне. Правільны адказ падкажу — жытам. Закусваецца напой незвычайнай стравай з хлеба, намазанага мёдам, і кавалачка салёнага агурка. Неверагоднае, здавалася б, спалучэнне, аднак смачна і вельмі дарэчы.

А вось мужчыну-добраахвотніку з групы прыйшлося пастарацца ў кузні, раздзьмухваючы мяхамі полымя і працуючы на кавадле, каб пасля падарожнікі маглі падсілкавацца ў пякарні самаробным хлебам з гарбатай і сырам. Зрэшты, вельмі смачны пачастунак.

Замяняльнік жонкі ды біла з качалкай

Далей турыстаў чакалі разнастайныя майстэрні, дзе ўмельцы ствараюць шыкоўныя вырабы з дрэва, саломы, металу, гліны. У ганчарнай турысты змаглі не толькі захапіцца гатовымі гліняными шэдэўрамі, але і ўбачыць, як з-пад рук майстра нарадзіўся новы гляк. Тутэйшы ганчар, дарэчы, валодае старадаўняй тэхнікай абпальвання сваіх вырабаў у спецыяльным саставе з мукі і агурочнага расолу. Пасля гэтага на гліняных збанах застаюцца непаўторныя ўзоры, з якіх немагчыма знайсці два аднолькавыя.

Майстрыха па саламяных цудах раскрыла крыху сакрэтаў гэтага дзіўнага матэрыялу, пасля чаго турысты фатаграваліся ў шыкоўных залацістых галаўных упрыгажэннях.

Пабачылі экскурсанты і першы прас у выглядзе біла і качалкі, і ручную маслабойку, і старажытную пральную машынку, і нават замяняльнік жонкі. Гэта спецыяльная драўляная прылада, з дапамогай якой п'яны гаспадар мог сцягнуць з ног скураныя боты, якія звычайна здымала жонка. А вы што падумалі?..

Вясковая даўніна — новы сусвет

Адна з кампазіцый музея выбіваецца з агульнай ідэі беларускай аўтэнтычнасці, аднак заўжды ўражвае турыстаў не менш за наведванне майстэрняў. Гэта калекцыя рэтра-аўтамабіляў, якія цягам многіх гадоў збіралі гаспадары Дудутак.

Самыя ахвочыя да ўражанняў напрыканцы захапляльнага падарожжа пракаціліся на запрэжаным вазку. Спрытны конік па мянушцы Вітас імчыць так хутка, што з першага ж падскоку «сялянскай карэты» разумееш, чаму лаўкі ў ёй абабітыя паралонам. Акрамя каня на гаспадарчым дварэ комплексу жывуць яшчэ кабанчыкі, каровы, козы, паўліны... А на 200 гектарах, якія належаць музею, вырошчваюць гародніну, з якой гатуюць для турыстаў адмысловыя нацыянальныя стравы.

— *Этнічна-самабытнае падарожжа ў музей Дудуткі прываблівае абсалютна ўсіх. Для іншаземцаў такая вандроўка — магчымасць даведацца пра беларускія традыцыі. Яны кажуць, што гэта нешта неверагоднае, быццам трапляеш у незразумелае вымярэнне. Ды і многія беларусы, якія ніколі не сутыкаліся з вёскай, здзіўляюцца элементам даўніны, якія там могуць пабачыць. Вельмі любяць прыязджаць туды з дзецьмі — для іх гэта проста новы сусвет,* — упэўнена **Юлія ШЫКУН, выконваючая абавязкі начальніка экскурсійнага аддзела прадпрыемства «Аўтаматычныя тэхналогіі турызму»**.

З такім меркаваннем цяжка не пагадзіцца, бо падарожжа хоць і пралятае, здавалася б, імгненна, уражанняў пасля сябе пакідае процьму. А яшчэ — пачуццё, што цяпер ты крыху больш уяўляеш сабе, чым займаліся твае продкі.

А наступным разам мы з тураператарам зоймемся прамысловым турызмам і наведаем прадпрыемства, якое стала адной з візітовак нашай краіны, — БелАЗ.

Ірына СІДАРОК

Беларускі тураператар «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму»
ЭКСКУРСІІ ПА БЕЛАРУСІ
Ekskursii.by
Санаторыі • Базы адпачынку • Турыстычныя комплексы • Гасцініцы • Трансфер
г. Мінск, вул.Сураўская, 10, оф.21, УНП: 190855081 +375 17 394 49 11 +375 29 768 30 00

Извещение о проведении 25 июля 2018 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, находящегося в хозяйственном ведении производственного унитарного предприятия «Промышленная база ФАНИПОЛЬ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
Быць першай асобай Беларусі яму выпала ў няпросты час — у пачатку 90-х. Менавіта пад яго кіраўніцтвам Вярхоўны Савет рэспублікі ў 1990-м прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Пасля жнівеньскага путчу ў 1991-м ён, падтрымаўшы Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы, застаўся верны сваім перакананням і сышоў у адстаўку, саступіўшы крэсла свайму намесніку Станіславу Шушкевічу. Многія яго паплечнікі і людзі, якія асабіста ведалі Дземянцея, успамінаюць Мікалая Іванавіча як выключна прыстойнага і сумленнага чалавека з добразычлівым і мяккім характарам. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, ён напісаў кнігу ўспамінаў «Урокі жыцця». Мы пагарталі яе і прыгадалі значныя для нашай краіны падзеі, сведкам і ўдзельнікам якіх быў аўтар.

Аб родных мясцінах

Мікалай Дземянцей нарадзіўся ў маі 1930 года на Віцебшчыне, у Чашніцкім раёне. *«Жылі мае бацькі ў пасёлку Рэчкі калгаса «Свабода» Вяцерскага сельсавета Чашніцкага раёна. Пасёлак быў пабудаваны на беразе ракі Свячанка ў 1922 годзе»*. Пасля бацькі пераехалі ў суседнюю вёску. Дзяцінства хлопчыка было апалена вайной. Ён скончыў тэхнікум і працаваў затым у розных раёнах, але родныя мясціны і Віцебшчыну ўспамінаў заўсёды. *«Самыя светлыя ўспаміны пра мясціны, дзе прайшло маё дзяцінства, захаваў і да гэтай пары. Калі мне становіцца цяжка, парушаецца сон і адпачынак, я ў думках пераношуся на прасторы, дзе нарадзіўся і рос, і атрымліваю дзіўную палёгку»*. Адметна, што ў заключным слове ў Авальнай зале, пасля галасавання за яго адстаўку, Мікалай Дземянцей, развітваючыся, падзякаваў жыхарам роднай Віцебшчыны, падтрымку якіх ён адчуваў заўсёды.

Аб першых асобах БССР і СССР

Мікалай Дземянцей працаваў поплеч з першымі асобамі БССР Пятром Машэравым, Ціханам Кісялёвым і Мікалаем Слюньковым. У кожнага з іх быў свой стыль кіраўніцтва.

Забаўны эпізод апісвае аўтар успамінаў з тады яшчэ сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым. *«Прыехаўшы напярэдадні правядзення семінару ў Мінск, Міхаіл Сяргеевіч выказаў жаданне дзенебудзь папаляваць. Яго адвезлі ў Белавежскую пушчу, экіпіравалі, выдалі карабін з аптычным прыцэлам. Магчыма, перад паляваннем яго няправільна праінструктавалі, як абыходзіцца са зброяй, магчыма, ён няправільна прыставіў яе да пляча, але факт застаецца фактам: пры аддачы карабіна пасля стрэлу акуляр прыцэла моцна ўдарыў Міхаіла Сяргеевіча пад вока, на твары ўтварыўся вялізны ліловы сіняк. Як кажуць, рана не смяротная, калі б не адна акалічнасць. На наступны дзень Міхаіл Сяргеевіч мусіў выступаць у саліднай аўдыторыі, больш за тое, ставіць задачы міністрам. Карацей, прыйшлося звяртацца да касметолагаў, якія наклалі на рану крэмавую маску. Здаецца, большая частка ўдзельнікаў семінара так і не заўважылі злашчасны сіняк. Праўда, твар Міхаіла Сяргеевіча ў той дзень быў нейкі не па сезоне загарэлы»*.

Аб чарнобыльскай катастрофе

Апісвае Мікалай Дземянцей (на той час сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, які курыраваў аграпрамысловы комплекс) і падзеі вясны 1986 года. *«У тую вясну мне прыходзілася практычна штодзень выязджаць у камандзіроўкі, каб не дапусціць збояў пасяўнога канвеера. Нічога не ведаючы пра тое, што здарылася ў гэту ноч на Чарнобыльскай атамнай станцыі, мы за дзень праехалі Магілёўскую вобласць з усходу на захад. На шляху не раз спыняліся, выходзілі з машыны, глядзелі ўсходы, размаўлялі з сялянамі, не заўважаючы, што на ўсіх нас ужо садзіцца нябачны смяротна небяспечны пыл... Позна ўвечары 26 красавіка ў рэспубліцы пачаліся нейкія незразумелыя перабоі з падачай электраэнергіі, хоць па іх наўрад ці магчыма было меркаваць, што ў краіне здарылася штосьці незвычайнае. Назаўтра, у нядзелю, усё таксама было спакойна. Многія гараджане, і я ў тым ліку, выехалі на дачныя ўчасткі... У панядзелак раніцай у кабінет да М. Слюнькова зайшоў адзін з вядучых спецыялістаў рэспублікі ў галіне ядзерных даследаванняў (цяпер акадэмік) Васіль Несцярэнка і паведаміў, што прыборы, якія маюцца ў атамшчыкаў, зафіксавалі над тэрыторыяй Беларусі, у тым ліку і над Мінскам, павышаны радыяцыйны фон. М. Слюнькоў тут жа патэлефанаваў першаму сакратару кампартыі Украіны У. В. Шчарбіцкаму.*

— Уладзімір Васільевіч, у цябе ўсё спакойна? — пацікавіўся ў суседа.

— Які ўжо тут спакой, Мікалай Мікітавіч, на Чарнобылі аварыя.

Цяпер Слюнькову ўсё стала зразумела: і нечаканыя адключэнні электраэнергіі, і павышаны радыяцыйны фон. Незразумелым заставалася маўчанне Масквы... Праз нейкі час стане вядома, што прычынай затрымкі інфармацыі аб трагедыі стала адсутнасць адзінства ў Палітбюро ЦК КПСС у тым, як паведаміць гэту вестку свайму народу і сусветнай супольнасці. Два дні ў кіраўніцтве краіны не маглі выпрацаваць дакладную пазіцыю па гэтым пытанні. Толькі пасля таго, як міністр замежных спраў Грамыка сказаў, што на стале прэзідэнта ЗША ўжо двое сутак ляжаць зробленыя са спадарожніка здымкі пашкоджанага рэактара, было прынята рашэнне аб перадачы па каналах ТАСС кароткага паведамлення. Наступны дзень Слюнькоў правёў у меркаванай зоне забруджання, наведаўшы Брагінскі і Хойніцкі раёны. Пасля святочнага шэсця ў сталіцы першы сакратар ЦК КПБ зноў паляцеў на Гомельшчыну і праінфармаваў старшыню Савета Міністраў СССР Мікалая Рыжкова, што кіраўніцтва рэспублікі мае намер пачаць эвакуацыю насельніцтва. Рыжкоў не пярэчыў. Ужо потым, пасля ад'езду Мікалая Слюнькова ў Маскву, з'явіцца нямала домыслаў, быццам бы першы сакратар ЦК КПБ у першыя дні адседжваўся ў кабінеце, бяздзейнічаў, кінуў людзей на волю лёсу. Па яго працоўным графіку можна прасачыць, наколькі насычанымі былі тыя дні... Заадно хачу развеяць і яшчэ адзін міф, што існуе і цяпер, аб быццам бы меўшым месца расстрэле радыёактыўнага воблака, якое рухалася на Маскву і Ленінград, а па іншых крыніцах, на краіны Захаду, над тэрыторыяй Беларусі. У першыя дні трагедыі і пасля я неаднойчы заводзіў гэту гутарку з вышэйшым кіраўніцтвам Саюза, размаўляў з вучонымі, ваеннымі. Ніхто з іх не пацвердзіў гэты факт. Не знайшоў пацвярджэння і ў партыйных, дзяржаўных дакументах таго часу. У тыя першыя гадзіны ўсім даводзілася думаць аб тушэнні рэактара, а не аб рассейванні радыеактыўнага воблака».

Аб дзяржаўным суверэнітэце

Гістарычны для нашай краіны дакумент — Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце — быў прыняты 27 ліпеня 1990 года народнымі дэпутатамі Вярхоўнага Савета БССР XII склікання. *«Самыя вострыя спрэчкі ў Авальнай зале, як я і меркаваў, выклікаў 11-ы артыкул, які датычыўся захавання членства нашай рэспублікі ў Саюзе ССР»*. Калі артыкул быў пастаўлены на галасаванне, група дэпутатаў на чале з Зянонам Пазняком і Станіславам Шушкевічам, якія былі супраць СССР, пакінула залу з воклічамі «Ганьба!», але сарваць прыняцце дэкларацыі ім не ўдалося.

Аб камандзіроўцы ў Вільнюс

У першай палове студзеня 1991 года будынак радыё і тэлебачання ў Вільнюсе захапілі сілы, якія выступалі за аддзяленне літоўскай рэспублікі ад СССР. У складзе дэлегацыі, якая павінна была разрадзіць напружаную палітычную абстаноўку, у Вільнюс паехаў і Мікалай Дземянцей. *«Перад будынкам Вярхоўнага Савета рэспублікі нас сустрэў шматлюдны ўзбуджаны натоўп. У цэнтры плошчы гарэў касцёр, уваход у будынак загароджвалі цяжкія бетонныя блокі і пліты»*. Зняць пагрозу ўзброенага канфлікту тады ўдалося. Праўда, праз два месяцы Вярхоўны Савет Літвы прыняў рашэнне аб выхадзе са складу СССР.

Аб падзеях 19—21 жніўня 1991 года

Аб тым, што ў краіне арганізаваны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (больш звыклая абрэвіятура — ГКЧП (ДКНС)), Мікалай Дземянцей даведаўся па радыё. *«Хутка сабраўшыся, я прыехаў на работу. Толькі пераступіў парог кабінета, як пачаліся званкі. Патэлефанаваў старшыня КДБ СССР Уладзімір Кручкоў (член ДКНС. — Аўт.). Яго цікавіла сітуацыя ў Беларусі. Я адказаў, што ніякіх праблем няма, і яны, хутчэй за ўсё, не ўзнікнуць.»* Але так званы путч скончыўся бясслаўна: вынікаў ён не прынёс, а яго арганізатары былі адпраўлены ў турму. *«Сёння можна казаць, што дзеянні ДКНС не мелі карыслівых інтарэсаў. Гэтымі дзеяннямі кіравала разуменне таго, што з перабудовай не ўсё ў парадку»*, — робіць выснову Мікалай Дземянцей. Ён падтрымаў ДКСН, а ўжо на наступны дзень пасля заканчэння путчу, 22 жніўня, вымушаны быў пайсці ў адстаўку. Пасля ў інтэрв'ю ён прызнаваўся, што калі б застаўся ва ўладзе, Белавежскіх пагадненняў не падпісаў бы.

Алена КРАВЕЦ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Начальная цена продажи – 102 570 руб. (сто две тысячи пятьсот семьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 10 257 руб. (десять тысяч двести пятьдесят семь рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 16 августа 2018 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 13 августа 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Гофробум», 223013, Минский район, Минская обл., д. Василевщина, здание зернохранилища № 2, к. 3

Предмет аукциона

Лот № 1 – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, пер. Менделеева 1-й, 50 (2, 3)

Наименование (Назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
Помещение общественного питания	635,2	500/D-708163897
Складское помещение	111,1	500/D-708163898

Начальная цена с НДС 20 %: 365 687,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Лот № 2 – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а (3, 4)

Нежилое изолированное помещение (помещение, не относящееся к жилищному фонду)	36,9	700/D-101889
Нежилое изолированное помещение (помещение, не относящееся к жилищному фонду)	884,8	700/D-101888

Начальная цена с НДС 20 %: 368 680,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Лот № 3 – изолированное помещение, по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Турова, 5-11

Административное помещение	32,9	700/D-128423

Начальная цена с НДС 20 %: 19 740,00 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**15.08.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**13.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ Легіянеры

ТЭСТАВЫ ТУРНІР ПРОЙДЗЕ Ў ВЕРАСНІ

Міжнародныя спаборніцтвы па бадмінтоне Belarus International прыме Мінск у рамках падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў

Турнір пройдзе з 6 да 9 верасня ў спартыўна-забаўляльным комплексе Falcon Club і стане першым стартам узроўню этапу Кубка Еўропы (з серыі «Ф'ючарс») па бадмінтоне. Да пачатку спаборніцтваў Мінск наведалі тэхнічны дэлегат Еўрапейскай канфедэрацыі бадмінтона Джымі Андэрсан і эксперты гэтай арганізацыі. Яны азнаёміліся з ходам падрыхтоўкі спартыўна-забаўляльнага комплексу Falcon Club да II Еўрапейскіх гульняў.

Як расказалі ў дырэкцыі, дэлегацыя канфедэрацыі бадмінтона абмеркавала пытанні правядзення і судзейства маючых адбыцца спаборніцтваў, вывучыла гульнявую і разміначную зоны спарткомплексу. Джымі Андэрсан высока ацаніў магчымасці аб'екта.

На II Еўрапейскіх гульнях 2019 года турнір па бадмінтоне будзе ісці ў залік чэмпіянату Еўропы. У чэрвені 2019-га ў Мінску разыграюць 5 камплектаў узнагарод: у мужчын і жанчын у адзіночным і парным разрадах, а таксама адзін — у змешаным парным разрадзе. Удзельнікам турніру прадставіцца шанц зарабіць рэйтынгавыя ачкі, неабходныя для кваліфікацыі на летнія Алімпійскія гульні 2020 года ў Токіа.

Беларусь і Францыя будуць развіваць супрацоўніцтва ў сферы спорту

Міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Францыі ў Беларусі Дыдзье Канесам

Бакі абмеркавалі стан і перспектывы супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў галіне спорту і турызму. Міністр падкрэсліў, што спартыўныя сувязі паміж Беларуссю і Францыяй паспяхова развіваюцца на ўзроўні многіх федэрацый па відах спорту. Нацыянальныя і клубныя каманды рэгулярна прымаюць удзел у міжнародных спаборніцтвах, якія праводзяцца на тэрыторыях абедзвюх краін. На думку Кавальчука, цяпер неабходна таксама ўмацоўваць сувязі па лініі спецыялізаваных навучальных устаноў, навукова-практычных цэнтраў і нацыянальных антыдопінгавых агенцтваў дзвюх краін, бо гэтыя кірункі супрацоўніцтва застаюцца актуальнымі і перспектыўнымі.

Пасол падаў міністру звесткі пра адну з французскіх кампаній, якая аказвае комплекс паслуг, звязаных з мантажом спартыўнага абсталявання. Дыдзье Канес запэўніў, што спецыялісты кампаніі маглі бы быць карыснымі Мінску ў перыяд падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў, паколькі маюць багаты практычны вопыт, у тым ліку працавалі на I Еўрапейскіх гульнях у Баку, на Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра і Пхёнчхане. Ён таксама папрасіў вывучыць магчымасць правядзення падчас Еўрапейскіх гульняў Міжнароднага танцавальна-парашутнага фестывалю інвалідаў-калясачнікаў, што магло б спрыяць сацыяльнай рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Што датычыцца турызму, то Францыя традыцыйна з'яўляецца папулярным напрамкам падарожжаў для многіх беларусаў, але зваротны паток турыстаў пакуль невялікі. У сувязі з гэтым бакі дамовіліся наладзіць больш цесныя кантакты і пастаянны абмен інфармацыяй.

У ЕЎРОПЕ СТАРТАВАЛІ З ПЕРАМОГ

Беларускія клубы ўдала правялі свае паядынкі ў першым кваліфікацыйным раўндзе Лігі Еўропы

Футбалісты мінскага «Дынама» гулялі ў гасцях у ірландскага «Дэры Сіці» і адкрылі лік ужо на 2-й хвіліне, гол на рахунку харвацкага легіянера Ніна Галавіча. У другім тайме перавагу павялічыў Уладзімір Хвашчынскі, устанавіўшы канчатковы лік сустрэчы — 2:0.

Салігорскі «Шахцёр» таксама на выездзе сапернічаў з валійскай камандай «Конас-Кі» і ў першым тайме двойчы паразіў вароты гаспадароў. На 21-й хвіліне вызначыўся Макс Эбонг, а праз 13 хвілін — Эліс Бакай. Трэці мяч на рахунку Міхаіла Шыбуна — 3:1 на карысць беларускай дружыны.

Паядынкі ў адказ беларускія клубы правядуць на сваіх палях 19 ліпеня, адзначым, што мінчане плануюць згуляць на абноўленым стадыёне «Дынама».

Нагадаем, брэсцкае «Дынама» пачне выступленне з 2-га раўнда кваліфікацыі. 26 ліпеня яны прымуць грэчаскі «Атрамітас» на сваім полі, а 2 жніўня згуляюць у Афінах.

Дзяніс ВАЛЫНЦАЎ:

«ПОЛЬШЧА СТАЛА ДЛЯ МЯНЕ ДОБРЫМ ТРАМПЛІНАМ»

Пра лёс і гандбол за 40 хвілін ад беларускай мяжы

РАЗЫГРЫВАЮЧЫ Дзяніс Валынцаў пачынаў сваю кар'еру ў родным Гомелі, а ў 19-гадовым узросце атрымаў добрую прапанову ад БГК імя Мяшкова. Правёўшы ў Брэсце два сезоны, гандбаліст вярнуўся ў ГК «Гомель», а летась адправіўся ў Польшчу па свой першы легіянерскі вопыт. У інтэрв'ю Дзяніс расказаў пра жыццё за мяжой, пра тое, чым адрозніваюцца беларусы ад палякаў, і падзяліўся меркаваннем наконт развіцця гульнявых відаў спорту ў нашых суседзяў.

— У 2012 годзе з роднага Гомеля ты вырашыў перабрацца ў Брэст, прапанова ад БГК была прывабная?

— Мая першая прафесійная каманда — «Гомель», гуляў там доўга, але хацелася расці. Прапановы ад БГК паступалі, калі мне было яшчэ гадоў 17, але кантракт з «Гомелем» скончыўся толькі праз два гады, тады я і вырашыў змяніць клуб. Магчыма, трохі паспяшаўся тады, хоць зараз, азіраючыся, задаволены, што паспрабаваў. Да таго ж менавіта ў Брэсце я знайшоў жонку *(усміхаецца)*.

— За два гады, якія ты правёў у БГК, там памяняліся чатыры трэнеры...

— Так, прыйшоў я, калі камандай кіраваў літовец Гінтарас Савукінас, яго змяніў Міглюс Астраўскас, потым былі Уладзімір Саўко і Жэлька Бабіч. Усе трэнеры розныя, з рознымі поглядамі на гандбол, падыходамі да трэніровак, але кожны з іх даў мне нешта сваё. У мой першы год у БГК мы занялі трэцяе месца ў чэмпіянаце, напярадзе былі толькі СКА і мінскае «Дынама», а потым з брэсцкім клубам я стаў чэмпіёнам краіны і ўладальнікам Кубка Беларусі.

— Але праз два гады зноў вярнуўся ў Гомель. Чаму?

— Іншых варыянтаў працягу кар'еры на той момант не было. У «Гомелі» мяне прынялі добра, правёў у родным клубе яшчэ тры гады.

— Але ж у канцы мінулага сезона зноў вырашыў памяняць клубную прапіску.

— Так, шукаў варыянты з'ехаць за мяжу яшчэ ў 2016-м, але тады мне прапанавалі толькі Ісландыю. Туды ехаць пабаяўся — у мяне жонка і маленькае дзіця. Яшчэ на год застаўся ў «Гомелі». А потым мной зацікавіўся клуб з Польшчы. З'ехаў туды і цяпер вельмі задаволены гэтым выбарам, дакладна ў маёй кар'еры гэта крок наперад.

— Раскажы пра свой польскі клуб?

— Зараз я выступаю за АЗС-АВФ, мы гуляем у першай лізе чэмпіянату Польшчы. Летась яны скончылі сезон на 9-м месцы, сёлета мы выканалі задачу і па выніках чэмпіянату сталі другімі. Гэта дало нам права выходзіць у вышэйшую лігу, але фінансавыя цяжкасці не дазволілі клубу выступаць у наступным годзе ў эліце. Каманда месціцца ў горадзе Бяла-Падляска, гэта недалёка ад нашай мяжы, насельніцтва там — каля 65 тысяч, невялічкі горад, але ўтульны, усе адзін аднаго ведаюць.

— Як цябе прынялі ў камандзе?

— Трэнер — беларус Дзмітрый Ціхан, таксама працаваў і гуляў у «Гомелі», ён мяне, уласна кажучы, і паклікаў да сябе. Яшчэ ў камандзе гуляе наш суайчыннік Максім Кручкоў, яны і дапамаглі ўладкавацца ў Бяла-Падлясцы. Клуб выдзеліў трохразовае харчаванне мне і маёй сям'і, кватэру, дзе ўсе камунальныя паслугі аплачваюцца. Калі ты гуляеш, паказваеш вынік, то ўсім, што табе трэба, у Польшчы забяспечаць на найвышэйшым узроўні.

Калі хочаш атрымаць дадатковы заробак, кіраўніцтва клуба можа дапамагчы знайсці дадатковую работу. Не хочаш працаваць, прымушаць ніхто не будзе. Трэнеры не супраць такой ініцыятывы, галоўнае, каб гэта не адбівалася на трэніровачным працэсе і гульні. У нас у камандзе, напрыклад, працуе варатар і яшчэ тры чалавекі паралельна трэніруюць дзяцей.

— Ці не палохала цябе, што клуб гуляе не ў вышэйшай лізе?

— Не, трэба было з чагосьці пачынаць, гэта стала для мяне добрым трамплінам. Калі ехаў у Польшчу, ведаў, што ў клубе ёсць гульцы і па 35—40 гадоў, ёсць і маладыя добрыя хлопцы. Калі параўноўваць з чэмпіянатам нашай краіны, то гэта клуб — узроўню трэцяй каманды, гэта значыць, «Гомеля». А наогул польскі чэмпіянат складаецца з трох ліг — вышэйшая, першая і другая. У кожнай з іх па дзве групы, у адной групе па 14 камандаў, у вышэйшай — 16 дружын. Атрымліваецца, што ў Польшчы за гэты сезон

я адыграў больш, чым у Беларусі за два гады. Матчаў было вельмі шмат.

— Бяла-Падляска знаходзіцца за 40 хвілін ад беларуска-польскай мяжы, тым не менш краіна ўжо іншая. Жыццё моцна адрозніваецца ад нашага?

— У Польшчы я не сутыкнуўся з нязвыклымі для сябе рэчамі. Там іншая ежа і мова, усё астатняе, мне здаецца, аднолькавае. Людзі не моцна адрозніваюцца ад нашых. У камандзе маем зносіны на польскай мове, першы час было цяжка, а пасля паўгода мог ужо спакойна размаўляць, калі трэба было нешта спытаць, растлумачыць. Я да іх прыехаў, значыць, сам павінен знаходзіць магчымасць вывучыць мову.

Ёсць невялікая розніца ў прадуктах, напрыклад, у польскіх крамах складана знайсці аўсянку, каб прыгатаваць дзіцяці на сняданак, няма звыклых для нас салатаў з маянэзам, сала, варанай каўбасы, сушанай рыбы. Супы зусім іншыя, больш падобныя на пюрэ. З польскіх страў, якія ўдалося пакаштаваць, спадабаліся журак, флякі і каркуўка — гэта свініна на грылі.

— Што палякі ведаюць пра беларусаў?

— У цэлым яны добра ставяцца да нашай краіны. Ведаюць, што ў нас вельмі любяць бульбу, і шмат жартуюць на гэтую тэму. Заўсёды, калі па дарозе на гульні, спыняемся дзе-небудзь паесці, яны бяруць сабе рыс, макароны, а я бульбу, што выклікае смех. Са знакамітых людзей, канешне, ведаюць беларускага Прэзідэнта і вядомых спартсменаў — Аляксандра Глеба, Дар'ю Домрачаву, Вікторыю Азаранку. Калі казаць пра гандбол, у Польшчы паважаюць нашу зборную, маюць пра яе добрую думку. Што датычыцца чэмпіянату Беларусі, то тут для іх вядомыя толькі СКА і БГК імя Мяшкова. Польскія гульцы не прыязджаюць на наш чэмпіянат, для іх перспектыва — гэта Германія ці Францыя, ды і ў мясцовым першынстве хапае добрых камандаў, дзе можна гуляць у еўракубках.

— Якія віды спорту найбольш папулярныя ў суседзяў?

— Футбол, гандбол, валейбол. Гульнявыя віды спорту ў іх вельмі добра развіты, таму што ў Польшчы шмат дзіцячых спартыўных секцый і досыць трэнераў. Усе настаўнікі атрымліваюць еўрапейскую кваліфікацыю. Адпаведна, у краіне шмат юнацкіх камандаў, адкуль потым прафесійныя клубы могуць браць людзей.

— За беларускім гандболам за мяжой сочыш?

— Гляджу навіны, чытаю нешта ў інтэрнэце, але не паглыбляюся. Па магчымасці глядзеў гульні СКА ў Кубку ЕГФ, БГК у Лізе чэмпіёнаў, але яны часта супадалі з маімі гульнямі, таму паглядзець анлайн не атрымлівалася. З беларускіх камандаў усё ж больш хварэю за «Гомель», шкада, што ў хлопцаў сёлета не атрымалася пазмагацца за «золата» чэмпіянату краіны.

— Як ацэньваеш узровень беларускага гандбола сёння?

— Вельмі шмат маладых гульцоў з'язджаюць за мяжу, таму што наш чэмпіянат больш падыходзіць для зусім маладых гандбалістаў ці людзей, якія ўжо блізкія да завяршэння кар'еры. На мой погляд, трэба павялічваць колькасці камандаў і ўзровень гульцоў, а для гэтага клубам патрэбен добры бюджэт.

— За адборам беларускай зборнай на чэмпіянат свету 2019 года сачыў?

— Так, глядзеў гульні з аўстрыйцамі, але не хочацца нічога казаць з гэтай нагоды, для гэтага ў іх ёсць трэнер.

— Дзе плануеш працягваць кар'еру?

— Пакуль застаюся ў польскім АЗС-АВФ, мной там задаволены, хочуць бачыць у складзе каманды. А калі ўзнікнуць варыянты больш цікавыя, гатовы памяняць клубную прапіску

■ Легенды спорту

«ЖЫЦЬ ТРЭБА ЯРКА, КАБ ЦЯБЕ ЗАПОМНІЛІ»

Перамогі і правалы ў жыцці алімпійскага чэмпіёна Ігара МАКАРАВА

Ён да гэтага часу застаецца адзіным беларускім дзюдаістам, якому ўдалося стаць алімпійскім чэмпіёнам, хоць пасля трыумфу Макарава ў Афінах прайшло ўжо 14 гадоў. Пасля Алімпіяды-2004 у яго біяграфіі значацца яшчэ Гульні ў Лондане, аднак на іх падняцца на п'едэстал беларус не змог. Сёння гэтую і іншыя свае няўдачы Ігар Макараў называе ўласнымі памылкамі і кажа, што іх ужо даўно перажыў. У інтэрв'ю «Звяздзе» алімпійскі чэмпіён расказаў, як груз залатога медаля ляжаў на яго плячах яшчэ год пасля Гульняў, чаму яму давялося працаваць на гомельскім заводзе і дзеліцца эмоцыямі, з якімі пакідаў вялікі спорт.

«Я рыхтаваўся да таго, што кар'ера скончыцца»

Ігар Макараў на татамі і сёння. На маё пытанне, чым цяпер жыве алімпійскі чэмпіён, ён адказвае: «Адпачываю». Хоць адпачынкам гэта назваць можна толькі ўмоўна. У Гомелі, дзе Ігар жыве з 8-гадовага ўзросту, мы заспелі яго ў перапынку паміж зборамі, якія завяршыліся ў Латвіі і пачынаюцца ў Балгарыі.

— Сёння вялікую частку часу аддаю сваёй невялікай школе дзюдо, якую адкрыў пасля завяршэння кар'еры. Што мне яшчэ было рабіць? Я ж паўжыцця правёў на татамі і развітвацца з гэтым, лічу, было немэтазгодна. Займацца нейкай іншай справай — душа не ляжыць, — расказвае былы спартсмен.

Школу дзюдо імя Ігара Макарава алімпійскі чэмпіён адкрыў праз паўтара года пасля завяршэння кар'еры.

— Калі эмацыянальна чалавек апустошаны, трэба развітвацца са спортам. Пасля Алімпійскіх гульняў 2012 года я яшчэ трохі бадаўся, а потым канчаткова накрыў крызіс. Вядома, сыходзіць было страшна, таму што жыццё наладжана, а тут трэба ісці ў невядомасць, але ж мы людзі загартаваныя, прайшлі не адну вайну *(усміхаецца)*.

Макараў прызнаецца, што ў гэтыя паўтара года ён зведаў непрыемныя хвіліны пошуку, але варыянты работы па-за спортам нават не разглядаў.

— Ісці штосьці прадаваць? Гэта не мой склад розуму, навошта выбіраць працу, якая табе загадзя не цікавая. Будаваць? Таксама не тое. З'язджаць з Гомеля не хацелася, я прыкіпеў да гэтага горада, з бацькамі з Расіі пераехаў сюды ў гадоў 8-9, але, калі вы спытаеце, ці беларус я, скажу, не. Я — гамяльчанін, гэта трошкі іншае.

Рыхтаваўся да таго, што кар'ера спартсмена скончыцца, але ўсё роўна гэта быў шок. Ніякіх мастоў я сабе не навёў, можа быць, дзесьці не дадумаўся сваім розумам, дзе сябе рэалізаваць, і ніхто не падказаў. Цяпер маёй школе ўжо тры гады, самае цяжкае на стадыі яе стварэння было знайсці залу, на гэта ў мяне сышоў год.

«Калі не я, то хто?»

У большасці выпадкаў тытулаваныя спартсмены, якія працягваюць кар'еру ў ролі трэнераў, аддаюць перавагу таму, каб працаваць з дарослымі, у Макарава гэтая пазіцыя прынцыпова іншая.

— Заўсёды прасцей узяць гатовых спартсменаў, а вось рабоце з дзецьмі, самай складанай, якая патрабуе масу сіл і цярпення, удзяляецца мала ўвагі, таму я пасядзеў, падумаў і вырашыў — калі не я, то хто? Сёння трэніроўкі з дзецьмі праводжу сам на пару з трэнерам, які мне дапамагае. Але, наогул, я скажу, што спартсмен — гэта ж не трэнер, перад тым, як ісці ў вялікае плаванне, усё роўна трэба набрацца вопыту, трэба пачаць з нізоў, зразумець, як адбываецца трэніровачны працэс, выпрацаваць методыку, адпрацаваць уклад свайго клуба. Таму зараз я толькі на пачатковым узроўні трэнерскага рамяства, — дзеліцца Ігар.

newsgomel.by

У групах алімпійскага чэмпіёна займаюцца дзеці пачынаючы з 4-гадовага ўзросту, уменне знаходзіць агульную мову да кожнага з іх прыходзіла з вопытам, а адносіны фарміраваліся ў працэсе трэніровак.

— Часам чалавек аказваецца ў такіх рамках, што думкі тыпу «падабаецца», «не падабаецца» сыходзяць на другі план. Ёсць работа, якую трэба рабіць, вось і ўсё. Першы час было наогул вельмі цяжка, таму што я нават не ведаў, з чаго пачынаць. Праграмы былі, а вось само стаўленне, як сябе паводзіць на трэніроўцы, што можна рабіць, чаго нельга... Трэба было выпрацаваць лінію паводзін, гэта прыходзіць толькі з вопытам. Наогул, самае складанае ў рабоце з дзецьмі — гэта цярпенне. Я працую з такім узростам, дзе трэба не толькі расказваць і паказваць, але браць і сваімі рукамі перасоўваць іх рукі і ногі.

Ігар Макараў не бярэцца прагназаваць, ці стане хтосьці з яго выхаванцаў тытулаваным спартсменам, перад сабой ён ставіць іншыя мэты.

— Скажу са свайго досведу: калі дзіцяці дадзена, у яго ёсць кардынацыя, рухавасць, увага, то ў далейшым ён будзе гультаём. Цяпер у мяне ёсць некалькі такіх дзяцей, у жыцці будзе момант, калі іх трэба будзе пераламаць, каб гультаі сталі працавікамі. А ёсць дзеці, якім не дадзена абсалютна, але ён упарты, як баран, і таму шмат чаго можа дасягнуць у жыцці. Я не пераследую мэту выхаваць барцоў, чэмпіёнаў, пры цяперашняй нашай сітуацыі ў свеце важна, каб дзіця выраслa чалавекам з вялікай літары. Спорт дапамагае выхоўваць унутраныя і вонкавыя якасці, — расказвае Макараў.

— У цэлым мне б хацелася змяніць методыку выкладання дзюдо, каб людзі пад іншым ракурсам паглядзелі на мой від спорту. Бо гэта не проста заломванні саперніка або яго кіданне. Дзюдо нашмат глыбей, там ёсць пэўная філасофія, якую трэба ўкараняць у розумы дзяцей.

На цяперашні момант у школе вядомага дзюдаіста займаецца каля 160 хлопчыкаў, ахапіць большую колькасць Ігар Макараў пакуль не можа фізічна і эмацыянальна.

«Спорт не разглядаў як справу свайго жыцця»

Як ні дзіўна, адукацыя ў алімпійскага чэмпіёна не фізкультурная. Ужо будучы пераможцам маладзёжнага чэмпіянату Еўропы, ён абраў для сябе політэхнічны інстытут, вучыўся на факультэце машынабудавання, а па яго заканчэнні атрымаў дыплом інжынера.

— Чалавек павінен заўсёды самаадукавацца. Акрамя машфака я скончыў магістратуру па педагогіцы. На гэты момант працую яшчэ і выкладчыкам у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. Сам вучыўся з першага да апошняга курса, ніякіх паблажак для мяне не было. Пасля школы пайшоў атрымліваць прафесію, таму што спорт не разглядаў як справу свайго жыцця і спосаб зарабляць грошы. У школе вучыўся ў фізмаце, заўсёды думаў, што буду інжынерам.

Пасля інстытута Макараву нават удалося папрацаваць на гомельскім заводзе «Сейсматэхніка». Перад хлопцам там адкрываліся вялікія перспектывы, раней бацька Макарава быў на прадпрыемстве генеральным дырэктарам.

— Але зноў жа ніякіх паблажак у мяне не было, працаваў, як і ўсе пасля ВНУ. Я рос у даволі жорсткай сям'і, з маленькага ўзросту ўкладвалася ў мазгі, што, калі ты хочаш быць кіраўніком, трэба прайсці ад нізу да верху, каб разумець увесь працэс вытворчасці.

А зразумець, што спорт — гэта сур'ёзна і можа стаць яго прафесіяй, Ігару дапамагла армія. Аддаваць доўг радзіме ён пайшоў у спартроту, служыць там было нашмат прасцей, дзякуючы трэніроўкам і зборам у часці Макараў практычна не знаходзіўся.

— Можна сказаць, што менавіта з гэтага моманту пачаў успрымаць дзюдо сур'ёзна.

«Вочкі заплюшчыў — і ты ўжо на лапатках»

На сваю першую Алімпіяду ў Афіны ў 2004 годзе беларускі спартсмен паехаў у рангу пераможцы маладзёжнага чэмпіянату Еўропы, бронзавага прызёра ўніверсіяды, чэмпіянату Еўропы і свету.

— На той момант быў адзін японец, якога мне трэба было перамагчы. Я выразна разумеў: калі выйграю ў гэтага дзюдаіста, то потым магу выйграць у любога. А атрымалася ўсё зусім не так. Японец да мяне нават не дайшоў, мабыць, зоркі яго не сышліся, але гэта мне жыццё на Алімпіядзе не палегчыла, спорт — такая непрадказальная справа, расслабляцца нельга. Сёння я кажу гэта сваім вучням: вочкі заплюшчыў — і ты ўжо на лапатках.

Сапернікам Макарава ў першай сутычцы алімпійскага турніру па іроніі лёсу стаў Асхат Жыткееў з Казахстана, гэта сябар Ігара. Пасля перамогі беларус скажа, што гэта быў самы цяжкі паядынак на Алімпіядзе-2004. У наступнай сутычцы Макараў перамог фінскага дзюдаіста Ціма Пелтала, потым грузіна Іверы Джыкураулі, у паўфінале адолеў галандца Элка ван дэр Гееста. «Залаты» паядынак Ігар Макараў выйграў у карэйца Яна Сун Хо і такім чынам здзейсніў мару, пра якую думаў 17 гадоў — атрымаў залаты медаль на радзіме Алімпійскіх гульняў.

— Жыццё змянілася, стала прасцей. Але раніцай пасля перамогі ты адчуваеш такое спусташэнне... Любы спартыўны буйны старт цягне за сабой напружанне не толькі фізічных сіл, але і маральных, якіх траціш значна больш, чым фізічных, і яны нашмат цяжэй папаўняюцца. Таму, калі прачынаўся раніцай, мне не хацелася нічога. Адчуваў вялікую збянтэжанасць і няўпэўненасць у заўтрашнім дні.

У такім стане спартсмен знаходзіўся яшчэ год і нават цяпер не можа назваць гэты алімпійскі медаль галоўнай узнагародай у сваёй спартыўнай кар'еры.

— Я не схільны капацца ў мінулым, ужо перайшоў на іншы ўзровень, разбірацца трэба ў цяперашніх справах, каб не затрымацца на тым месцы і не быць чалавекам аднаго дня.

«Афіны памятаю не так добра, як Лондан»

Цяпер званне алімпійскага чэмпіёна не часта нагадвае пра сябе. Народ у родным горадзе пазнае Макарава, але хваля вядомасці ўжо даўно схлынула. Пасля той перамогі на Гульнях-2004 у планах спартсмена не было завяршаць кар'еру, таму ён паспрабаваў адабрацца на наступную Алімпіяду ў Пекін, але гэта алімпійскаму чэмпіёну не ўдалося.

— Быў вельмі моцна засмучаны. Гэта мая віна, у 2008 годзе адчуваў вялікія праблемы з вагой. Пасля Пекіна я многае пераасэнсаваў, жыццё пайшло крыху па-іншаму. Адсеялася шмат людзей з майго акружэння. Пасля таго, калі ты быў на кані, не хочацца станавіцца пасрэдным спартсменам, таму з'явілася больш амбіцый, жаданне паспрабаваць яшчэ раз дасягнуць той вяршыні, на якой ужо пабываў. Кожнае падзенне ў жыцці цягне пераасэнсаванне, кожная няўдача гэта таксама велізарны досвед.

Праз восем гадоў пасля трыумфальных Афін Макараў трапіў на другія ў сваёй кар'еры Алімпійскія гульні, здавалася, што ў Лондане паўтор поспеху ці хоць бы проста алімпійскі п'едэстал быў так блізка. Але памылка ў чвэрцьфінале з карэйцам Кім Сан Мінам пазбавіла Ігара фіналу, а асечка ў сутычцы за трэцяе месца з немцам Андрэасам Цёльцерам пакінула без алімпійскага медаля.

— Афіны памятаю не так добра, як Лондан. Вядома, я застаўся незадаволены пятым месцам. Гэта зноў жа мая віна, хоць сябе я ўжо даўно не вінавачу, усё гэта ўжо прайшло.

Яшчэ год пасля Лондана-2012 Макараў спрабаваў змагацца, але зразумеў, што час сыходзіць ужо прыйшоў.

— Думаю, што ў маёй кар'еры спартсмена склалася ўсё вельмі нядрэнна. А самым складаным момантам усё ж такі быў час станаўлення, калі выхоўваліся якасці, неабходныя для таго, каб перамагаць, і не толькі ў спорце.

На пытанне аб тым, ці варты прафесійны спорт таго, каб на працягу доўгіх гадоў марнаваць на яго столькі здароўя, эмацыянальных і фізічных сіл, Ігар адказвае ўпэўнена і адназначна.

— Безумоўна, варты. Жыць трэба ярка. Доўга ці не, багата або бедна, але ярка, так, каб цябе запомнілі, не разумею, для чаго хадзіць у шэрай масе, гэта не так прыемна. Сёння я мару пра новую залу, а маёй самарэалізацыяй у плане трэнера будзе калі выхаванцы школы дзюдо Макарава стануць добрымі людзьмі. Вядома, ёсць трэнерскія амбіцыі, але калі праз 20 гадоў вучні ўспомняць добрым словам, гэта будзе для мяне самае лепшае, што можна ўявіць.

г. Гомель

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Статусбанк

ОАО «СтатусБанк»

www.stbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт	На 01.07.2018 г.	На 01.07.2017 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		6 587	5 341
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		2 544	1 749
5	Средства в банках	1104		10 930	13 309
6	Ценные бумаги	1105		15 013	38 806
7	Кредиты клиентам	1106		57 491	49 017
8	Производные финансовые активы	1107		14	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		3 124	2 923
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		94	55
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		680	393
14	**ИТОГО активы**	**11**		**96 477**	**111 593**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		141	740
18	Средства клиентов	1203		35 677	49 478
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		1 099	6 401
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		1 311	833
23	ВСЕГО обязательства	120		38 228	57 452
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		43 000	43 000
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		11 308	8 504
28	Фонд переоценки статей баланса	1214		168	192
29	Накопленная прибыль	1215		3 773	2 445
30	ВСЕГО капитал	121		58 249	54 141
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**96 477**	**111 593**

Отчет о прибылях и убытках на 1 июля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт	На 01.07.2018 г.	На 01.07.2017 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		7 046	8 505
2	Процентные расходы	2012		897	1 312
3	Чистые процентные доходы	201		6 149	7 193
4	Комиссионные доходы	2021		1 265	744
5	Комиссионные расходы	2022		274	76
6	Чистые комиссионные доходы	202		991	668
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		4	28
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		1 824	1 879
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		14	(48)
11	Чистые отчисления в резервы	207		(1 352)	1 656
12	Прочие доходы	208		623	496
13	Операционные расходы	209		7 069	6 448
14	Прочие расходы	210		292	196
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		3 596	1 916
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		936	531
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**2 660**	**1 385**

Председатель Правления В.А. Драгун

Главный бухгалтер С.С. Ящук

Дата подписания: 9 июля 2018 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 26 от 25.05.2017 г. УНП 807000043

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ на строительство объекта

«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича»

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Застройщик: ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

Юридический (почтовый) адрес: 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – пятница 8.15–15.45, конт. тел.: (017) 2072060, (044) 7771158;

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве заказчика построены следующие объекты: «16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева» Срок строительства: ноябрь 2013 г. – август 2015 г., «Многоквартирный жилой дом со встроенными административными помещениями по генплану № 13 в микрорайоне № 2 реконструируемой застройки в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)» Срок строительства: ноябрь 2014 г. – июнь 2016 г., «Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13» апрель 2017 г. – апрель 2018 г.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Многоквартирный жилой дом запроектирован трехсекционным, 16-этажным, на 235 квартир, с техническим подпольем и техническим этажом. Высота типового этажа – 3 метра. Конструктивная схема здания многоквартирного жилого дома – сборно-монолитный безригельный каркас «КУБ». Наружные стены здания запроектированы из керамзитобетонных блоков.

Проектом предусмотрено размещение:

– многоквартирного 16-этажного жилого дома на 235 квартир;

– двухэтажной гараж-стоянки открытого типа на 191 машино-место;

В каждой секции запроектировано по 2 лифта, грузоподъемностью 1000 кг и 400 кг.

На типовом этаже запроектированы квартиры состава 2-2-3-3 в 1-й секции, 2-1-1-3-1-1-3 во 2-й секции, 2-2-3-3 в 3-й секции. Все квартиры запроектированы со свободной планировкой, перегородками выделены санузлы.

Проектом предусматривается свободная планировка квартир, за исключением ванных, туалетов и ниш инженерного оборудования. Устройство внутриквартирных перегородок, установка межкомнатных дверей, внутренняя отделка квартир не выполняется.

Начало строительства – декабрь 2017 г. Окончание строительства в соответствии с проектной документацией – июнь 2019 года. Планируемый Заказчиком срок ввода объекта в эксплуатацию – декабрь 2019 года.

Строительство жилых помещений будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее-договоры).

Гражданам, не нуждающимся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров предлагается 44 квартиры (с включенным в стоимость строительства квартиры машино-местом), расположенные на 2-м, 7-м и 12-м этаже жилого дома, из них – 11 однокомнатных, общей площадью 43,72 кв. м – 50,62 кв. м, 15 двухкомнатных, общей площадью 57,16 кв. м – 63,94 кв. м, 18 трехкомнатных квартир общей площадью 80,79 кв. м – 93,18 кв. м.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения и машино-места в гараже-стоянке открытого типа.

Стоимость строительства 1 кв. м для однокомнатных квартир (с включенным в стоимость машино-местом): 1185 – 1212 долларов США.

Стоимость строительства 1 кв. м для двухкомнатных квартир (с включенным в стоимость машино-местом): 1118 – 1137 долларов США.

Стоимость строительства 1 кв. м для трехкомнатных квартир (с включенным в стоимость машино-местом): 1068 – 1082 долларов США.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартир, а также включенного в стоимость крытого либо открытого машино-места.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком на день платежа.

Условия оплаты: первоначальный взнос в размере 50 % вносится в следующем порядке: в течение 5 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме – 20 % от стоимости договора, в течение последующих 25 календарных дней – в размере 30 % от стоимости договора. Оставшаяся сумма выплачивается поэтапно, в соответствии с графиком платежей, до декабря 2019 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение государственной экспертизы: РУП «Главгосстройэкспертиза» № 147-15/17 от 29.04.2017 г.).

Свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка от 08.02.2018 г. № 500/1719-2762.

Получено разрешение Инспекции Госстройнадзора по г. Минску № 2-206Ж-037/17 от 28.12.2017 года на производство строительно-монтажных работ.

